Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул., № 29.

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна також падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто нэ захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. — 20 Чэрвеня 1914 г. — № 24

Просімо п. п. Падпісчыкоў „Нашай Нівы“, каторые падпісаліся толькі на першую палавіну 1914 г., чым хутчэй аднавіць падпіску, каб не было перарыву у высылцы газэты.

## За тыдзень.

Гасударственная Дума ужо прыпыніла сваю працу. Дэпутаты пракрычаўшы «ура» раз'ехаліся, на адпачынак.

Раз'ежджаліся дэпутаты, як відаць, здаволеные, што апошняя сэсія была гаманлівая, што яна рабіла ўражэньне на грамадзянство працавітай. Але гэта было адно толькі ўражэньне, бо запраўды хоць гоману было і многа дыкарысьці мала. Гас. Дума не патрапіла адстаяць правоў грамадзянства ані ў законе аб друках і газэтах, ані праглядаючы гасударственны бюджэт, ані адстаяла правы мейсцовых моў у мейсцовых судах, а нават, як сьлед, не патрапіла Дума бараніць сваіх правоў, калі урад хацеў пацягнуць пад суд дэпутатоў за прамовы з думскай трыбуны.

Раз'ехалася Гас. Дума на адпачынак пасьля гаманлівай сэсіі, але што яна зрабіла для абяздоленых і абезпраўленых?

Ці чулі мы з Думскай трыбуны хоць колькі слоў закінутых у абарону, кругом абезпраўленых, беларусоў? А ад нашай-жэ зямелькі, ад імені нашага народу, сядзелі людцы у Думе, сядзелі і не чырванелі с сораму, што маўчаць у той час, калі розные Замыслоўскіе са сваей хаўрузіей даводзілі, што беларусы усё маюць, што ім усё пазволена на раўне з расейцамі.

Упаўнамочэнные ад зямлі нашай слухалі гэтаго і маўчалі...

І ніхто ня кінуў слова, што гэта няпраўда. Што беларусы, не поўнапраўные, а безпраўные грамадзяне у Расеі. Што Беларусам няможна вучыцца грамаце у роднай мове, няможна маліцца у роднай мове, ня можна судзіцца у роднай мове. Што беларусоў каталікоў запісываюць у палякі пры выбарах у гас. Думу і пры паступленьні у школы і на гасударственную службу і тады, калі беларус-каталік хочэ прыкупіць зямелькі.

«Беларусы карыстаюць усімі правамі нараўне з вялікарусамі»— кажуць правые расейскіе партіі. Але якіе беларусы? Тые, што адракліся свайго народу, што разам з ворагамі волі і долі гэтаго народу узяўшыся за ручкі не даюць жыць і дыхаць Беларусам? Так, карыстаюць гэтые апошніе з усіх правоў, але яны не нашы. Яны за сочэвічную поліўку, за панскую ласку, за чырвонцы, прадалі свае сыноўскіе правы і як такіе прад добрымі людзьмі, перад бацькоўскімі касцьмі і перад Богам, не маюць права называць сябе імем Беларусоў, бо яны адракліся яго.

І хоць гаманлівая была апошняя сэсія Думы, але яна не патрапіла бараніць правоў пакрыўджэных і не магла гэтаго рабіць, бо у ей не было праўдзівых абаронцаў народу і ня будзе іх датуль, пакуль цяперэшні закон аб выборах у Гас. Думу ня будзе праменен.

**Лемеш**

## За „А ўсё-ж такі мы жывём“.

Наша стацьця «*А усё-ж такі мы жывём*», як і трэ было спадзевацца дужа не спадабалася тым ягомасьцям, каторые за ўселякую цану хацелі-бы, каб мы, беларусы *не жылі*. І вось паслухаймо, якімі спосабамі гэтые праціўнікі беларускаго жыцьця выяўляюць сваё нездаволеньне.

Начнём ад «господина» Солоневіча. Прыводзючы у сваей газэцы «Сѣверо-Западная Жизнь» № 129 г. г. першую часьць нашай стацьці (у перэкладзе ня саўсім граматным), у яго вырываецца крык:

> «Читая эту галиматью, никакъ не разберешься, о чемъ собственно рѣчь, какихъ новыхъ боговъ выдумалъ «Рэдактар Выдавецъ І. Луцевичъ».

Крык гэты дужа шчыры і мы яму верым. Совы і начніцы сонца не бачуць. Паном Саланевічам усё будзе «*галиматья*», што толькі па-беларуску не напішэцца. Для перакінчыкоў законы жыцьця і праўда-справядлівасьць у рахунак ня йдуць. Але пагледзім далей. Вось ён друкуіць адрывак нашай стацьці:

> «І наша бацькаўшчына перэжывала і перэжывае тое самае. Душылі яе палякі, цяпер душаць яе і польскіе і расейскіе націоналісты, вядучы між сабой нікчэмны спор за славянскую душу беларуса, але ўсё гэта мела і будзе мець свой канец. Будзіцца самопачуцьцё народнае, падыймаець старонка наша свае вочы к сонцу і распрастовываець свае магучые плечы».

І што-ж за атказ на гэта выдумаў п. Саланевіч? Ды проста па «істінно-русскі»:

> «Что вы скажете на это, читатель? Развѣ не просится на уста ваши н е ц е н з у р н о е ругацельство».

Важна сказана. За словы «падыймаець старонка наша свае вочы к сонцу» грозюць нам паскуднай лаянкай. Ня будзь губэрнатарскіх пастанаўленьнёў аб хуліганстве і цэнзурнага устава, то «нецензурныхъ ругательствъ« «Сѣв.-Зап. Жизнь» як відаць, не пажалела-б для сваіх чытачоў.

Далей п. Солоневіч расьпінаецца, што беларусы ад расейскіх націоналістоў апрача аднаго дабра нічога благога і ня мелі і, як прымер, прыводзіць гаспадарку у нашым краю вялікаго націоналісты Муравьёва. Мы ня будземо спрэчацца с «Сѣверо Западнай Жызн'яй» аб Муравьёве —на што нябошчыка трывожыць, — мы толькі зьвернім увагу жывых, што калі Муравьёв гаспадарыў у Беларусі, то ў тым часе і поміну ешчэ не было аб тых патэнтованых расейскіх націоналістах, створэных на абраз і падобіе Солоневічаў, Пурышкевічаў, Замыслоўскіх і таму падобных. Іх, гэтых патэнтованых «валяй патріотоў», вытварылі нашы апошніе часы: безупынная рэакція, наступіўшая посьле сьветлых праблыскаў 1905 г. Аб гэтых націоналістах, каторые хацелі-б усё чыстае і сьветлае у Расеі апаганіць запыніць і павярнуць усё яе жыцьцё назад— у крэпасьнічэства,—мы і гаварылі у сваей стацьці. Але п. Солоневіч прыкідаецца незнайкаю (па расейску—«валяетъ дурака») і лжэць, перакручываючы нашу шчырую думку на свой націоналістычны капыл. Супакойся, п. націоналіст! Беларус добра патрапіць раскумекаць, хто і як да яго гаворыць і хто яму болей родны і вечны, а хто чужы і дачэсны. А што да «лганья», якое вы быццым знайходзіця у „Н. Н.“, то... астаўляем гэты інтэрас тым, каму за „лганьё“ добра плацяць, а мы і з бесплатнай праўдай неяк жылі і будзем жыць. Казённых подачэк не шукалі мы і шукаць не збіраемся.

* * *

За «Сѣв. Зап. Жизнь'ю» і «Виленскій Вѣстникъ» наваліўся на нас і сфабрыкаваў на сваіх страніцах чуць не маленькі данос на «Н. Н.» і яе рэдактара. «Виленскому Вѣстнику» укалолі у пяты і сольлю сталі ў воку словы з надпісі над стацьцёй у «Н.Н.» — «забраны край». І вось у № ад 15 чэрвеня г г. давай плясьці па свойму, што вось у «Н. Н.» новы рэдактар, дык і новы курс узяла газэта. Прыплёў к чамусьці сюды тутэйшых палякаў, ад каторых мы апрача нападак на манер Солоневечаўскіх нічога іншаго не знаем. Адным словам „Вил. Вѣст.“ падняў цэлы гвалт. І найболей усё бьець на фразу „забраны край“, каторай быццам дагэтуль не спатыкалося у „Н. Н.“ і каторую, быццам у рэдакціі цяпер сфабрыкавалі.

Вот-жэ скажу тут, што „Вил. Вѣст.“ праспаў у шапку свае абавязкі даносьніцтва. Верш, с каторага частку прыводзіць «Вил. В.», быў надрукованы цэлікам у «Нашай Ніве» у 1911 г. № 47–48. Словы ж «Забраны край» ня простая выдумка аўтора, а ўзяты з этнаграфічнага зборніка: «*Матеріалы для изученія быта и языка русскаго населенія Сѣверо Западнаго края. Собранные и прыведенные въ порядокъ П. В. Шейномъ. С. П. Б 1902 г. Изд. Императорской Академіи Наукъ*». Там, у гэтым зборніку Акадэміі Наук, т. III, стр. 97 сказана: «Вообще о себѣ и своей странѣ они (селяне Гродненской губ.) выражаются так: „мы тутэйшые, наша страна ні руска, ні польска, але „забраны край!“

**І. Л.**

## Земство і воласць.

V

**Што рабіць цяпер.**

Трэба спадзевацца, што некалі земская гаспадарка будзе нарыхтавана гэтак—як гаварылася у папярэдніх раздзелах, —трэба ісьці к таму і рупіцца, каб як найхутчэй усё гэта збылося.

Ну, а пакуль што, як будзе? Што рабіць у цяперэшняй воласьці, як выбіраць гласных у земствы Міншчыны, Магілёўшчыны, Вітэбшчыны.

Ці можна дапусьціць, каб у валасные начальства выбіраліся тые, хто болей барышоў дае, ну а посьле, калі надарыцца зручнасць дык і «растрату» зробіць. Лепшые, святлейшые селяне самі ня хочуць пападаць у валасные начальства, ня толькі ня рупюцца каб выбіраць на гэтые мейсцы людзей з пасярод сябе, але і агулам трымаюцца у старане ад валасных выбароў. Ці добра гэта? Не. Гэта блага. Праўда, цяперэшняя воласць дайжэ толькі тое і робіць, што спаганяе з народу падаткі і павіннасьці. Гэтымі справамі яна так завалена, што рабіць культурную працу не мае ані часу ані грошы. Гэта—так. Але, падаткі і павіннасьці ўсё роўна спаганяцца будуць, хто бы ня быў старшыной, напр. калі старшына будзе разумны і сумленны дык хоць парадак які небудзь у валасных справах будзе, хоць за гарэлку ці хабары ня будзе крыўда перэмагаць праўды, хоць сабраные падаткі і валасные грошы будуць цэлы. Калі-ж старшына жулік, ён сам шмат можэ нашкодзіць, напсаваць, калі ён проста дурэнь, дык пісар, хаваючыся за старшыновым хрыбтом, можэ уселякай усячыны нарабіць. Ніхай сабе посьле гэта раскрыецца, будзе суд. але пакуль там што — дык шкоды і непарадку досіць. А ешчэ і па пакараньню вінаватых—накрадзенае імі бывае, што і прападае зусім. Воласьці чыстая страта. Вось каб гэтаго не было, трэба выбіраць людзей сумленных. Дзе-не-дзе па Расеі (і ў Беларусі гэтак сама) —дзе народ разумнейшы —валасное начальства выбіраецца ужо і цяпер, не загарэлку, а як павінна быць. Трэба каб гэтак было усюды.

Ешчэ большае значэньне маюць выбары гласных у земствы. Вітэбскіе, мінскіе і магілёўскіе; селяне павінны добра разумець тое, што для іх далёка ня ўсё роўна якіе будуць гласные. Земскіе гласные селяне не павінны сядзець і маўчаць, або прадавац-

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны

### Сьвята Купалы.

«Беларускі Музыкальна-Драматычны Кружок у Вільні» ладзіць, так як і тые гады, на 23 чэрвеня сьвяткаваньне Купальля.

### Выстаўка літоўскіх друкоў.

Аткрылася у Вільні першая выстаўка літоўскіх друкоў. Выстаўка паказывае што здолелі зрабіць літвіны за апошніх 10 год для адраджэньня сваей бацькоўшчыны. Трэба прызнаць, што літвіны шчыра папрацавалі: на выстаўцы багата уселякіх кніжэк і часопісоў, шмат кніжак выданых з вялікім штукарскім смакам.

### Новые шоссавые дарогі.

Міністэрство дарог маніцца рабіць абследаваньня у справе будоўлі новых шоссавых дарог. Праектуюцца шоссавые дарогі 1) ад Мінска праз Барысоў у Оршу; 2) ад Вілейкі праз Лепэль у Вітэбск; 3) ад Барысава праз Бярэзіну у Ігумен; 4) ад Ігумена у Могілёў; 5) з Навагрудка у Слонім; 6) з Ліды у Навагрудак; 7) з Навагрудка у Замірье (даўней Гарадзея); 8) ад Несьвіжа у Піліпавічы.

### Выстаўка скаціны у Вільні.

4 верэсьня у Вільні пры Віленскім Сельска гаспадарскім Таварыстве адбудзецца выстаўка скаціны і малачарскіх прылад. Для селянскай скаціны і друг. экспонатоў (выстаўляных рэчэй) мейсцы безплатна. На выстаўцы будуць чытацца лекціі па сельскай гаспадарцы.

### Выстаўка у Друі.

Друйскі Сельска-Гаспадарскі Кружок 14, 15 і 16 верэсьня устраівае у Друі Сельска-гаспадарскую выстаўку. На выстаўцы будуць чытацца лекціі па сельскай гаспадарцы.

### Пажары.

= 9 чэрвеня згарэў **двор Барткушкі** памешчыка Ледніцкаго. Згарэў дом дворны, бровар, хлявы, клеці, стайні і інш. Страт болей як на 100,000 руб.

= Згарэло **Мястэчко Ротніца** у троцкім павеці. Згарэло 130 сяліб з усім дабыткам Страт болей як на 90 тысяч.

= Гэтымі днямі згарэла **вёска Пруды** у ашмянскім павеці, налібоцкай воласці. Згарэла 41 сяліба з усім жывым і мёртвым дабыткам.

= У вёсцы **Каўмянах** эйшышскай воласці, Лідзк. пав, пярун ударыў у комін хаты Маркевічоў і пасьля, ўляцеўшы у хату, забіў Антаніну Маркевіч.

= Пажар у вёсцы **Кавальцах** зніштожыў 26 гаспадарак. Страт больш як на 28 тысяч руб

### Змаганьне с пьянствам.

У **Воўкалаці**, Вілейскаго павету на валасной сходцы селяне пастанавілі пазачыняць усе шынкі у воласці як манапольскі, так піўные і рэстараны.

### Даўгінава, Вілейск. пав.

Усім ужо, як відаць, надаелі манапольскі, в сь і нашы Даўгіноўцы нідаўна сыйшліся на сход каб зрабіць такі прыгавар. Але такі давясці да канца прыгавар было ня лёгка. Шмат было такіх, каторым падпісацца пад прыгаварам было дужа цяжка. Усё-ж такі прыгавар падпісалі і паслалі да губэрнатара. Цяпер усе чэкаюць атказу ад губэрнатара на прыгавар. Найгорэй тое, што нашы селяне, адказаўшыся ад гарэлкі, бяруцца за піва.. Кажуць: «піва і танней каштуе і спарней пьецца. Прымеціўшы гэта, я пайшоў на разведкі да Рубіна і Рубін мне вось што сказаў: «Дагэтуль я бывала прадаваў піва у тыдзень на 20 руб., а пяперэка на 160 р,б. у тыдзень». А ці скора даўгінаўцы пяройдуць с піва на квас—нет недама.

5 чысла, гэтаго месяца, быў у нас дзень «Белай кветкі» на карысць „Лігі змаганьня с сухотамі“. Кажуць што сабралі шмат грошы.

Каля Даўгінава, у вёсцы Пагост, ад неасцярожнасці с папіросай, загарэлася пуня Эйрышэвіча і пажар раскінуўся на усю вёску. Згарэло 15 хат, 9 хлявоў, 3 клеці і шмат інш. *В. Со—скі.*

## З Міншчыны.

### Мінск.

9 чэрвеня адбылося заседаньне, сэкціі па агнеупорнай будоўлі, мінскай землеустраіцельнай камісіі. Пастаноўлена аткрыць у 1915 гаду 19 новых кахлёвых майстэрэнь і выдаць падмогі па 3,000 р. тром рэмесьнікам-селянам на аткрыцьця цагелень Земство у свой чарод пастанавіло аткрыць у міншчыне 9 кахлёвых майстэрэнь для выробу кахлі на крыцьцё будынкоў і пастанавіло закупіць на 50,000 руб. бляхі да крыцьця будынкоў. Бляху будзе земство даваць селянам на выплатку. Усяго мінскае земство пастановіло страціць у 1915 гаду 165,373 рублі на агнеупорнае будоўніцтво!

### Аткрыцьце новых школ.

Больш 30 селянскіх грамад Ігумен.п. звярнулося у земскую управу просючы, каб земство цааткрывало у іх новые школы. Селяне бяруць на сябе павіннасць даць дарма зямлю пад школы (па аднэй дзесяціне), вывезьці матэр'ял да будоўлі і праз дзесяць гадоў плаціць па 50 руб. на утрыманьне кожнай школы. Земство пастанавіло здаволіць просьбу 20 селянскіх грамад і пааткрываць новые школы і народные бібліотэкі у іх да верэсьня гэтаго году, рэшце адмовіло за недахватам грошы.

### Багаты дар.

Стары памешчык Н. Руданов, з рэчыцкаго павету, будуе у вёсцы Ассарэвічах вялікую мураваную бальніцу, а пры ей амбулаторыю і кватэры для дактароў. Бальніца абойдзецца яму каля 100,000 руб. Выбудаваўшы бальніцу Рубаноў падарыць земству.

### Самоўбіўствы.

= У Пінску павесілася крамніца Рэйза Ёсельсон Кабета яна была ужо не маладая—гадоў 50.

= У в Юшчыўшчыне, Самахвалавічоўскай воласці павесілася селянка Анна Наркевіч 55 гадоў. Нябошчыца была вхора падучай хваробай.

= У Бярозаўках, Ігуменскаго пав., павесіўся 14 гадовы хлопчык Пётра Матусэвіч.

### Пажары і буры.

У Міншчыне, многа у якіх паветах, гэтымі часамі, былі вялікіе буры і улеўные дажджы, каторые нарабілі многа страт. Было шмат пажароў ад пяруноў. Наагул у гэтым гаду усюды буры дужа пярунісьтые, кажуць гэта таму, што бяздротны тэлеграф перэдае багата электрыкі у хмары і с хмар электрыка разам з дажджамі прабіваецца у ніз да зямлі і робіць многа шкоды.

= У в. **Змітравічах**, Барысаўскаго павету, 5 чэрвеня у поўдзень пяруном забіло селяніна Саўку Лабача і яго жонку. На Тройцу яны згулялі сваё вясельля Гэтым самым пяруном пакалечыло ешчэ адну кабеціну і 7 гадоваго хлопчыка. Другім пяруном у гэтай вёсцы папсавала страху на селянскім магазыне.

= У мястэчку **Уздзе**, Ігум. пав., 7 чэрвеня узняўся страшэнна гвалтоўны пажар, у кароткі час агонь зьмёў каля 100 сяліб.

= У в. **Ольсавічах**, стваловічоўскай вол., згарэла 15 сяліб з усім дабыткам. У часе пажару усе узрослые былі у полі. Агонь запарушылі дзеці.

= У трох вёсках Мозырскаго павету згарэлі 134 сялібы з усім дабыткам які быў у селян. Страт болей як на 125 тысяч руб.

= Згарэла вёска **Селішчэ** Агонь зніштожыў 70 хат і 185 халодных будынін. Страт болей як на 100,000 руб

---

а наадварот верылі б, што яны паступаюць па праўдзі, па справядлівасьці, што яны робюць найкарысьнейшае дзела з дзел. Што-ж лепшаго над тое, як даць жыцьцё чэлавеку? Што-ж лепшаго над тое, як даць жыцьцё людзям? Што, што? Што не вазьмі, гэта будзе усё мала».

Так думаў Саўка, сын роднай Беларусі. І мала што Саўка думаў, Саўка чэкаў часіны, калі ён сваім жыцьцём зробіць ніхай і «мікроскопічную» вёсцы, але ўсё-ж такі карысць. Саўка думаў: «Я троху, другі троху, во і будзець дзела. .» Саўка радаваўся за будучыну. Радаваўся за хлапцоў, дзеўчат, каторые пасыпалі с цёмненькіх беларускіх хат шукаць сьвету, шчасьця Вялікі шмат з іх адшукаюць сабе долі, адшукаюць правы, каб не ўсякі над імі мог здзекавацца. Але што гэта. Адшукаўшы долю, Саўцы думалося, яны не пяройдуць да тых, каторые толькі сябе лічуць людзьмі а яны пойдуць у бацькоўскіе хаткі, дзе калісь-то радзіліся і гадаваліся. І гэтые паборнікі, сыны тых, каторые гэткіе загнаные, галодные, цёмные, бедные, каторые усё жыцьцё мучуцца,—загаворуць да іх шчырым говарам. Скажуць: «Бацькі родные, міленькіе дзяды, вы мучэніцы маткі, вы беленькіе браточкі, сястрыцы, даволі цярпець, даволі ўжо цярпелі мы ад цемнаты, трэба праснуцца. Сонейко грэй мацней, мы бачым цябе цяпер, нам ясна цяпер усё, усё... Людзі, брацьця! Трэба жыць! Жыць. Грэй сонейко. Гуляй ветрык».

Калі Саўка перайшоў у апошні клас, то ён ніяк ня мог даждацца, ці скора гэта ён акончыць і пойдзець сеяць праменьня сьвету па вёсках І ён чэкаў гэтай часіны.. Як быў Саўка на Вялікадня дома, то ён раз намяркаваўся схадзіць на зборку. Саўка хацеў паслухаць, аб чым гаворыць барадаты люд, бо яму трэба, як можна лепей ведаць, што за чэлавек у жупане, які яго пагляд. І Саўка пашоў. Прышоў, ён калі жыхары былі усе у зборы. Яны сядзелі каля Сцёпкавай хаты і надта голасна гаварылі. Ніяк нельга спазнаць, хто што гамоніць і хто слухаець. . Але во, Саўка падыйшоў, зняў шапку. «Здрастуйця Савель Петровіч»,—пачулося неколькі галасоў. Саўку пачалі абглядаць з усіх старон. Ён відзіў гэта, відзіў, што ён разбіў такі цікавы разгавор. — «Ці бачыш ты, што с Саўкі зробіцца паніч»,—неяк зразу прагаварыў сівы дзед Піліп. І гэтые словы былі чутны усім Саўка ужо хацеў нешта сказаць, як паляцелі адно за другім пытанні.—«А што, Савель, ужо скора кончыця», — гаварыў узноў Мікола селянін гадоў сарака, у камізэльцы, салдат, ахвотнік пафарсіць што ён многа сьвету бачыў.—«І тады ўжо недзе вучыцелям. а можэ і далей захочыця,»—загаварыў узноў Мікола.— «Вучыцелям», — атказаў якбы не сваім голасам Саўка.—«А што, Савель Петровіч, з вамі нябось вучуцца усё панскіе дзеці?» — пытаў стары Капітон, каторы хацеў вучыць у гарадзкім вучылішчы ўнука ды ўсё жалеў грошы. — «Усякіе, усякіе», — прытка адказываў за Саўку Мікола. — ‹У салдатах, прымерна, такім-жэ парадкам робіцца, як і ў вучылішчы. Усё гэта парадак, строга... — ‹Нябось і чай пьець з булкамі, не гаруе, як мы тут»,—працадзіў забіты мужычок Антон, копцючы неба з люлькі. — «Э, хэ, хэ» — пачаў узноў Мікола. — «Ды няўжо-ж ён так чай любіць. Ведама, для вучонаго, гэта першая страва, прымерна, як і для салдата...» Але Міколу перабіў Грышка, каторы часта ездзіў ізвозам і відзіў як па заездах пьюць і закусываюць. — «Ен негдзе і «куктаво»*) есць», -- прыгаварыў Грышка вытарашчыўшы вочы на Лапцёва, як бы гаворучы гэтым, што: «братку, хоць я і мужык, а ведаю». — «Эх ты, пень балотны, ды дзе ты чуў «куктаво», зусім не «куктаво», а «каактааво›. Бывала гэта, як выйдзем, прымерна, на манеўры, то кожын дзень, во і прапусціш гэтак с чарачку. Якбы што заскрабець апасьля. Дужа слаўна». — «Ну дык гэта ня тое, я відзіў—рэзалі.. » Апраўдываўся Грышка.—То то! Бадай рэзалі вятчыну,› заявіў Мікола, увесь сіяючый, маўляў, глядзіця, во які я разумны, усё ведаю. — «А грошы сколькі атрымываць будзіця?»—Няўздзержыўся Сенька храмы адзінокі, сярэдніх гадоў селянін, вядомы вясковы скупец. — «Дзесятку негдзе. .» атказываў Мікола — «Ого, кучка!» — пачулося з усіх старон. — «Во даждаўся, Петрык падмогі, во як слаўна. — «Ён даб'ецца і далей». Гаварыў Мікола, пазіраючы на Саўку, каторы ня ведаў, што з ім творыцца.—«Будзе калі небудзь панам, ці то дзякам. Гэта, бач, талань. Прымерна, у чацьвёртай році быў гэта у нас зводны, з бедных. Вось ён і пашоў на навукі і далей і далей. Кажуць, што ужо паручнікам. Усякі гэтак можэ, абы ахвота ды розум». — «Охо, хо, во, відзіш талань.. дзіяканам, во і Саўка ..» — гаварылі селяне, расходзючыся дамоў.

Саўка ня мог спаць. — ‹Якжэ гэта так? Якжэ іх вучыць? Што гэта такое?› І як не варочаўся Лапцёў, як не сплюшчываў вочы, яму усё здавалося, што ён на сходзе. — «Не, як буду вучыцелем, тады будзе ня тое. Не, не,—зусім ня тое». І чэкаючы будучыны, Саўка не кідаў навучацца таго, што яму будзе трэба перэдаваць вёсцы. — »О, многа чаго трэба для вучыцеля» — думаў Саўка і гэтые думкі не адбівалі ахвоты да працы а наадварот, Саўка больш трудзіўся. Бацька Саўкі таксама чэкаў тэй часіны, калі сын будзе з грашамі, і калі ён яму паможэ. Усе чэкалі вучыцельства Саўкі; сам Саўка, бацька, матка, Граська, катораму абецаў Саўка, што с першай палучкі купіць яму шапку і кніжку. Дай Бог табе, Саўка, сустрэціць вучыцельства з радасьцю і ў здароўі.

**Добранец.**

*) Какао.

**Змаганьня с пьянствам.**

Ад таго часу, як маніфэстам, на імя міністра фінансоў, пазволена было закрываць селянам шынкі, селяне мінскай губэрні да першых чысел гэтаго месяца, падалі губэрнатару 75 прыгавароў аб закрыцьці шынкоў у 105 сёлах. Найболей прыгавароў зроблена было пад канец мая. Шмат якіе селянскіе грамады бяруць самі на сябе павіннасць пільнаваць за тым, каб не было у іх тайных шынкоў. Апрача гэтаго, апошнімі часамі селяне па ўсей губэрні не перэстаюць састаўляць прыгавары аб закрываньню шынкоў.

= У **Барысаве** адбылося паветовае сабраньне у справе змаганьня с пьянствам. Абдумалі колькі розных способоў.

= У в. **Воўкашанцы**, рэчыцк. павет. селяне пастанавілі прыгаварам закрыць манапольку.

= У **Пінску** адбылося паветовае сабраньне у справе змаганьня с пьянствам.

= У **Нароўлі**, рэчыцк. пав. на валасным сходзе пастанавілі селяне пазакрываць усе шынкі у граніцах воласьці і пільнаваць шчыльна каб не было патаёмнаго шынкарства.

Гэткіе самые пастановы вынесены у міншчыне у вёсках: Касцюкова, Баравое, Падбярэжжэ і на валасным сходзі у мястэчку Лошы

= У **Негневічах,** Навагрудзкаго павету, селяне пастанавілі закрыць манапольку.

## З Вітэбшчыны.

Каля Вітэбска па сёлах бегаюць шалёные сабакі і пакусалі шмат людзей і скаціны. Пакусаных шалёнымі сабакамі людзей вітэбскае земство атпраўляе у Оршу у пастэроўскую лекарню рабіць прышчэпкі шалу, бо шал, так як і воспа, калі яго раней прышчапіць, то чэлавек, пакусаны і заражэны шалам, не шалее. Кожны тыдзень атпраўляюць у Оршу чэлавек 20—30, гэта значыць, што шалёных сабак у нас бегаець дужа многа. Многа скаціны пашалело і падохло, найболей сабак і авец, але былі здарэньня што шалелі і коні, каровы, а гэта ужо вялікая страта нашым селянам. Даўней пакусаную скаціну лячылі нашы чараўнікі, а цяпер земства завяло вэтэрынароў, каторые куды удачней лечуць скаціну. Адзін вэтэрынар прыходзіцца у нас на тры воласьці. Апрача гэтаго у Вітэбскай губэрні селянская скаціна падае ад сібірскай пошэсьці, яшчура; сьвіньні дохнуць ад свінной рожы і дзеля гэтаго земскім вэтэрынарам работы многа.

Дзеці мруць ад шкарлятыны.

У многа якіх валасцях Гарадокскаго пав. пабіло у шчэнт градам жыта і ярыну. А у полацкім павеці ярына мейсцамі павыгарала ад жары. Вада па палёх і руччох павысыхала і недзе паіць скаціну. С прычыны гарачаго і сухога лета дужа многа пажароў і выгараюць цэлые сёлы.

*Шчыры.*

Вясной у гэтым гаду паявіліся у паветах Двінскім, Новаалександраўскім і ў другіх паветах вітэбск. губ. агенты ад нейкаго падрадчыка, каторы будаваў у Сібіры, за Краснаярскам чугунку. Гэтые агенты сталі заклікаць ахвотнікоў ехаць у Сібір на заработкі. Ахвотнікоў знайшлося многа, іх падахвоцілі дармовым праездам і вялікімі заработкамі Паехало колькі сот душ. Але калі прыехалі, то аказалося усё іначэй, як казалі агенты. Ім сказалі працаваць за 35 р у месяц на сваіх харчах. А харчы там дарагіе. Змяркаваўшы, што працаваць пры гэткіх варунках прыйдзецца дарма і галадаючы, работнікі адмовіліся стануць на работу. За гэта іх атправілі па этапу дамоў. Дзе праўда?

*С.*

## З Могілёўшчыны.

Іду я у Горкі. За тры вярсты ад Горак. каля бальшака. вёска, як і ўсе вёскі Беларусі. Дужа замарыўся Дай каля кладак прысяду. Сеў. Вір, а каля рэчкі пяць хлопчыкоў гадкоў шасці, васьмі і рвуць кветкі, явар Убачылі, што я сяжу. Падышлі падкасаные. На твары гразь. вочкі надта блішчаць. Таўпяцца. Упорна глядзяць на мае боты. — Садзіцеся, дзеткі. — Баяцца.. Во і абзнчёміліся. Прыселі.— Як завуць? —Курыла, Граська Мікола ..—Вучыцеся? Бацька есць? .— Есць. Гарэлку надта пьець. А дзяцей нас чатырэ, зямлі дзьве дзесяцінкі. Паедзем у Томск.— А што гэта вы гуляеця, а ня робіця нічога. Памагалі бы бацьцы працаваць. — Німа чаго рабіць. — Ну дык бы вы кніжкі чыталі — Німа кніжэк. Вучыцелька, што ў зімку вучыла, атабрала, а ешчэ німа ніякіх.—А хто у вашай вёсцы вучыцелька? — Якась то паненка з Горак Яна кожын дзень прыезджаець на „лясапетах“ с панічамі у вёску нашу і ў вучылішчы жартуюць. А кніжак недаець і німа дзе ўзяць. —

Хлопчыкі, хлопчыкі, як трудна шукаць вам шчасьця, долі. Пашоў я не вясёлы, а яны забрыкалі шыбка, шыбка у кусты. О, хлопцы, што вас ажыдае у будучыне?..

Каля мяне прагудзела на велісапедзе паненка з двумя панічамі. І стыдна, ой як сорамна перад сонейкам, прад ветрыкам, што так ціха шуміць кветкамі, сорамна што сонейко адно толькі, як сьветка, глядзіць роўна на праўду і няпраўду, на чыстае, сьветлае і...

*Хадзяка.*

# З усіх старон.

**Убіўство аўстрыяцкаго насьледніка.**

У Сараеві, калі праежджаў на аўтомобілі з жонкай у ратуш аўстрыяцкі насьледнік трону, Францішак-Фэрдынард, нехта кінуў бомбу у аўтомобіль Бомбу насьледнік аткінуў рукой і яна ўзарвалася толькі тады, калі аўтомобіль ужо ад'ехаў. Разаршваўшаяся бомба раніла двух людзей са сьвіты і шэсць душ с публікі. Выявілося пасьля, што кідаў бомбу друкар Цабрановіч і яго арэштавалі. Пасьля прыёму у ратушы, насьледнік выехаў ізноў на аўтомобілі з жонкай у горад. У гэтым часе гімназіст 8 класа, Гаўрыла Прынцып з Грахава, выстрэламі з рэвольвэра (браўнінга) раніў насьледніка у твар, а яго жонку у жывот. Раненые скора памерлі. Гімназіста арэштавалі.

**Суд над адвакатамі.**

У Пецербурзі судзілі адвакатоў, каторые падпісалі пратэст проці рытуальных судоў, прызнаючы, што гэтые суды толькі зняважаюць тых, каторые іх узнімаюць. Засудзілі 2 адвакатоў на 8 мес. у турму. а 18 на 6 месяцоў у турму кожнаго. Усе засуджэные выслухалі прысуд спакойна. С публікі дзе хто протэставаў проці прысуду. Рада прысяжных адвакатоў у Пецярбурзі ушанавала засуджэных тарыскім абедам.

**Забастоўкі.**

Пачалася хваля вялікіх экономічных забастовак. У Пецярбурзе бастуе больш 30 тысяч работнікоў. У Кастроме бастуе каля 35,000 душ. У Кінешне—каля 15,000 душ. У Баку на карасінных крыніцах забастоўкі усё ешчэ не спыняюцца і як мяркуюць у міністэрстві торгу, то ешчэ доўга прэцягнуцца Палажэньне работнікоў у Баку дужа трудная. Сперша гаспадары карасінавых крыніц не хацелі здаволіць справядлівых і невялічкіх вымагоў работнікоў і забастоўка зацягнулася, не было заработкоў. А пасьля гаспадары хацелі прымусам узяць работнікоў і загадалі павыганяць іх с кватэр. Гэто выклікало абурэньне і упор у работнікоў. Цяпер 20 тысач работнікоў астаецца на вуліцы. Мейсцовые, Бакінскіе газэты с прымусу маўчаць. Карасінапрамыслоўцы, гаспадары карасінавых крыніц, пастанавілі ня йсці на ўступк і «скруціць работнікоў у баран рог».

**Цыркуляр аб закрываньні манаполяк.**

Міністр фінансоў, Барк, прызнаў патрэбным выдаць новы цыркуляр, устанаўліваючы парадак закрываньня шынкоў. Паводле гэтаго цыркуляру манапольки павінны закрывацца зара пасьля уцьверджэньня губэрнатарам прыгавару хоцьбы кватэра пад манапольку была заарэндавана на колькі гадоў і прышлося-б плаціць неўстойку; прыватные ж шынкі трэба закрываць пасьля выхаду сроку на патэнт.

**Пахароны работніка.**

У Рызе работнік Александроў сам сабе атабраў жыцьцё пасьля таго, калі яго прагналі с фабрыкі затое, што ён быў выбраны работнікамі упаўнамочэнным ад работнікоў у кассу стрэхаваньня работнікоў.

Пахаронную працэсію праводзіло больш 10,000 чэлавек. Блізка усе работнікі, што былі на пахаронах, мелі у руках чырвоные кветкі. Пахаронную працэсію праводзіла конная і пешая паліція, усяго было паліцэйскіх болей 200 душ. На магілу вябошчыка налажылі груд вянкой. Калі магілу засыпалі работнікі прапеялі „Вечную памяць“.

**Закон аб забастоўках.**

Міністэрство ўнутрэнных спраў апрацавало праект закону аб змаганьні з забастоўкамі. Праект гэтаго закону прызнае права мешацца паліціі у забастоўкі: 1) калі работнікі выстаўляюць апрача экономічных і палітычные вымаганьня; 2) калі забастоўкі зацягіваюцца і робюць шкоду насяленьню; 3) калі забастоўкі бываюць у грамадзкіх установах: гарадзкіх, правіцельных і інш. Апрача гэтаго мае быць навелічэна кара за падбіваньне да забастовак.

## Жарты.

**Шчыры.**

Праезджы чэлавек да селяніна.

— «Я згубіў тут недзе, каля вашай вёскі, анталак з гарэлкай. Можэ вы знайшлі яго?

С е л я н і н: — „Калі-б я знайшоў яго, той анталак з гарэлкай, то ён лежаў-бы пусты, а я сам поўны на баку пры ім“.

**Прычына.**

— „Чаму гэта, куме, ніколі ня ходзіш у цэркву, як табе ня брыдка!“

— „О то-ж, мая жонка, як толькі прыдзе сьвята, саўсёды крычыць на мяне за гэта, але я за яе крыкам не магу пачуць калі зазвонюць.

**М. Г.**

Рэдактар-Выдавец

**І. Луцэвіч.**




Не купляйце парашкоу (попелоу—штучных гноеу) абы дзе па крамках, а купляйце там дзе прадаюць за справедлівую цэну добры тавар

у складзі **Віленскаго Тавырыства Сельскай гаспадаркі.**

*Вільня, Завальная № 9.*

Купляйце хаурусна цэлымі вагонамі, тады абыходзіцца найтаней.

Там-жэ можна купляць усякую гаспадарскую прыладу.

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.